## *ФИЛОЛОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ*

**УДК 821.161.3-1/.-4*А.Вярцінскі**

***К. С. Афанасенка***

# ГЕРОЙ-ПРАМЕТЭЙ У МАСТАЦКАЙ СІСТЭМЕ АНАТОЛЯ ВЯРЦІНСКАГА

*Мэтай артыкула з'яўляецца асэнсаванне на матэрыяле літаратурнай спадчыны А. Вярцінскага адметнасцей стварэння героя-праметэя. Аўтар увасабляе архетыповы вобраз Праметэя як праз аўтапсіхалагічнага, так і праз ролевых герояў – чалавека (мужчыну і жанчыну) і праз нежывую істоту. У сваіх творах А. Вярцінскі ў апазіцыю "праметэям" уводзіць так званых "непраметэяў", якія з'яўляюцца супрацьлегласцю першым. Робіцца выснова пра гуманістычны характар героя-праметэя і пра прынцып непраціўлення злу гвалтам, але пры гэтым захавання прынцыпу актыўнага дабра пры ўвасабленні паэтам гэтага вобраза.*

Паэзія Анатоля Вярцінскага вылучаецца падкрэсленай гуманістычнай скіраванасцю, любоўю да чалавека, што яскрава адбілася праз адметныя рысы, якімі надзелены героі яго вершаў і паэм. У мастацкай літаратуры вобраз чалавека, або істоты, якая яго замяняе, называецца па-рознаму, у залежнасці ад роду літаратуры. Калі характарызаваць герояў паэзіі А. Вярцінскага, то найбольш слушна будзе выкарыстаць паняцце "лірычны герой". Па словах В. Рагойшы, гэтае паняцце "<…> (часам – вобраз паэта, лірычнае «я») – умоўны тэрмін, якім абазначаюць вобраз, што ўзнікае ў свядомасці чытача ў выніку знаёмства з лірычнай творчасцю таго ці іншага паэта. Лірык выяўляе ў вершах свае думкі і пачуцці, настроі і перажыванні, свае адносіны да з'яў і падзей навакольнай рэчаіснасці. Але формы гэтага выяўлення могуць быць розныя, падчас нечаканыя" [1, с. 48]. У адносінах да асобы пісьменніка лірычны герой, нават набліжаны да яго, якога прынята называць аўтапсіхалагічным, захоўвае сваю самастойнасць. У творах А. Вярцінскага лірычны герой таксама знаходзіцца ў цеснай сувязі з аўтарам, але не атаясамліваецца з ім. У паэта ёсць і героі ролевыя, але яны, як і аўтапсіхалагічныя, нясуць найперш гуманістычную ідэю.

Адвечныя тэмы – чалавек і грамадства, жыццё і смерць, любоў і нянавісць, неахопнасць жыцця і нязменнасць у пошуках ідэалу – А. Вярцінскі асэнсоўвае з пункту гледжання сучаснага чалавека. Нягледзячы на тое, што пісьменнік у сваіх паэтычных творах нярэдка выкарыстоўвае старажытнагрэчаскія міфы як першааснову, чытачы бачаць архетыповыя вобразы Праметэяў і іх антыподаў, увасобленых у сучасных рэаліях. Утрапёнасць і самаахвярнасць герояў, іх жыццесцвярджальная сіла, сцвярджае А. Вярцінскі, – у тым галоўным пачуцці, якое дазваляе ім ствараць у імя дабра.

Імкненне да ідэалу можна заўважыць ва светаўспрыманні творцаў Рэнесансу (эпохі гуманізму), якія асаблівую ўвагу надавалі апяванню прыгажосці чалавечай душы. Антычны вобраз Праметэя выступае архетыпам самаахвярнай любові і ўвасабляе лепшыя здабыткі чалавечага розуму. Нездарма гэты вобраз з'яўляецца ў творчасці такіх знакамітых асоб, як Гётэ, Вальтэр, Камю, Байран і інш. А. Вярцінскаму, як і яго папярэднікам, вобраз Праметэя дапамагае асэнсаваць ідэю духоўнай свабоды і ўнутранай гармоніі чалавечай асобы. Выратавальны агонь – гэта агонь любові нябеснай ці зямной, якая перамагае ўсе бедствы і нягоды: хваробы, смерць, цемру, страх, эгаізм, – а таксама надае сэнс чалавечаму існаванню на зямлі. Ахвярнасць і заўсёдная гатоўнасць

Праметэя адказаць любоўю на агрэсію ў “Варыяцыях на тэму «Гефест – друг Праметэя»” А. Вярцінскага спачатку можа падацца гіпербалізаванай, нават абсурднай:

“Арол піць будзе кроў тваю!”
“Арла таго я палюблю...”
“Святла пазбаўлю, асляплю!”
“А я змрок вечны палюблю...” [2].

Тлумачэнне такой інтэрпрэтацыі паэтам вобраза Праметэя падае В. Русілка: “Размова ідзе не аб пасіўнасці, не аб непрымальнай безабаронасці перад сіламі зла, а, наадварот, аб усёперамагаючай сіле любові. Гэтым трактоўка вобраза адрозніваецца ад класічнай і, у прыватнасці, ад канцэпцыі Чалавека ў Э. Межэлайціса, аўтара цэлай тэорыі праметэізму як актыўнага дабра” [3, с. 14]. У аснове філасофіі героя А. Вярцінскага – прынцып непраціўлення злу гвалтам. Характары як Праметэя, так і Гефеста, які з-за сваіх хваляванняў і нерашучасці здраджвае сябру, для А. Вярцінскага не толькі міфалагічныя, але і рэальныя, у нечым нагадваюць нацыянальныя, беларускія.

Герой у разуменні пісьменніка не той, хто сам сябе адчувае ружовенькм бязгрэшнікам і клапоціцца за свой ці нечы святы арэол. Гераізм не бывае пасіўным. Пасіўнымі бываюць толькі сарамлівасць і баязлівасць. Герой паэта ўсім сэрцам перажывае за лёс свайго народа, усёй планеты. Ён не толькі спачувае людзям, але і разумее сваю адказнасць за тое, што будзе сёння, заўтра і далёка ў будучыні.

Многіх, здавалася б, непадобных, герояў лірыкі паэта аб’ядноўвае менавіта імкненне самаахвярна служыць людзям. Да такой катэгорыі належаць вобразы маці, вясковых жанчын увогуле, удзельнікаў Вялікай Айчынай вайны і, нарэшце, міфалагічных персанажаў Праметэя і Спартака (паэмы “Дажынкі” і “Начны бераг”, “Варыяцыі на тэму «Гефест – друг Праметэя»”, вершы “Поезд справядлівасці”, “Да герояў” і інш.). Светланосны пачатак – агульная рыса ў характарах гэтых, на першы погляд непадобных, персанажаў. Паводле перакананняў паэта, менавіта ён вызначае сапраўдную сутнасць асобы.

Разам з тым А. Вярцінскі настойліва і бескампрамісна дзеліць людзей на “праметэяў” і “непраметэяў”. Да апошніх паэт адносіць зайздроснікаў, мяшчан, Гефеста і хунвэйбінаў – бяздушных ваяўнічых (вершы “Непраметэі”, “Хунвэйбіны”, “Акіян і лужына”, “Пра воўка памоўка” і інш.). Яны ўяўляюць сабой згустак цемры, якому, аднак, не дазволена перамагчы святло і дабро. Кожная эпоха, на думку пісьменніка, спараджала як сваіх “праметэяў”, так і сваіх “непраметэяў”, якія часцей за ўсё ўступалі ў бескампрамісную і жорсткую барацьбу:

А мы... мы не лезем на ражон,
тым больш – на ражон небяспечны.
А мы свае пальчыкі беражом,
баімся іх апеч мы.
Мы прыкавалі моцна сябе
да скалы уласнага страху.
І не арол нашу печань дзяўбе,
а верабей з суседняга даху.
Звычайны, шэранькі верабей,
якому ўсё роўна чым пажывіцца –
мякінай,
          крывёй,
                    рудой вадзіцай, –
абы чырыкаць было весялей… [4, с. 85]
          (верш «Непраметэі»)

У 70-я годы XX стагоддзя А. Вярцінскім была напісана паэма “Начны бераг”, прысвечаная такім важным філасофскім праблемам, як чалавек і прырода, сэнс жыцця і мэта творчасці. Твор насычаны жывапіснымі малюнкамі гомельскага парка, хаця пейзажнай

лірыкі ў творчасці паэта ў цэлым вельмі мала. Галоўным героем у паэме з'яўляецца рака Сож, апісанню якой прысвечана большая частка твора. Сэнсавобраз сонца тут А. Вярцінскі ўзвёў да праметэеўскага архетыпу. Як піша В. Русілка, "сонца тут – сімвал актыўнага альтруізму, што ратуе Сусвет ад цемры і бруду, і аданачасова – сімвал розуму, рацыянальнага пачатку, які арганізуе гарманічнае існаванне прыроды" [3, с. 14]. Як бачым, да герояў паэзіі А. Вярцінскага, якія суадносяцца з архетыпам Праметэя, належаць не толькі людзі або жывыя істоты, але і неадушаўлёныя прадметы, прыродныя з'явы, касмічныя целы. Даволі яскрава вобраз сонца ў такой трактоўцы паўстае ў наступным урыўку паэмы:

Ды справа ўсё-такі не ў ім,
а справа ў гэтым светлым цудзе,
якое сонцам завуць людзі,
якое робіць вёсны з зім,
дзень з ночы і вясёлку з хмары,
якое свеціць зноў для нас,
не патрабуючы ў адказ
ні ўзнагароды, ні ахвяры.
Нам сонца, думаў я далей,
дае высокі ўзор служэння,
вялікадушнага свячэння... [4, с. 178]

Як было адзначана вышэй, са шматлікіх пресанажаў, якія ўтрымліваюць у сабе рысы "праметэеўскага" характару, можна вылучыць вобраз маці ці вясковай жанчыны. Адным з такіх паказальных персанажаў стала Аксіння з паэмы "Дажынкі". Г. Пашкоў адзначае, што "Аксіння з паэмы А. Вярцінскага «Дажынкі» таксама належыць да племя Праметэяў, хаця і не зрабіла нічога, каб пра яе загаварыў свет. Ды што там свет… Занядужыла, дык ніхто не спагадаў: ні брыгадзір, ні ўчотчык, ні нават блізкі ёй чалавек. А цётка ўсё жыццё здабывала і дарыла людзям жыццядайныя іскры таго самага Праметэевага агню – сеяла жыта і жала" [5, с. 7]. Гераізм Аксінні народны, ён ціхі, нетаропкі, але дзейсны і настойлівы. Яна на працягу ўсяго жыцця аддавала сваю працу людзям.

Такім чынам, вобраз героя-праметэя ў творчасці А. Вярцінскага мае гуманістычную скіраванасць, з'яўляецца ўвасабленнем самаахвярнай любові і ўтрымлівае ў сабе лепшыя здабыткі чалавечага. Праметэеўскімі рысамі паэт надзяляе як аўтапсіхалагічных, так і ролевых герояў. Адрозненне трактоўкі архетыповага вобраза А. Вярцінскім палягае ў прынцыпе непраціўлення злу гвалтам, але пры гэтым захавання прынцыпу актыўнага дабра. Адметнасцю з'яўляецца і наданне гэтаму герою рыс нацыянальнага беларускага характару. Вобраз Праметэя дае пісьменніку магчымасць асэнсаваць ідэю духоўнай свабоды і ўнутранай гармоніі чалавечай асобы. А. Вярцінскі бескампрамісна дзеліць герояў на "праметэяў" і "непраметэяў", якія хоць і дзейнічаюць у аднолькавых абставінах, але з'яўляюцца супрацьлеглымі па сваёй прыродзе. Вобраз-архетып Праметэя можа рэалізавацца не толькі праз герояў-мужчын ці жанчын, але і праз неадушаўлёныя істоты (касімчныя целы).

**Літаратура**

1 Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / Вячаслаў Рагойша. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 576 с.

2 Вярцінскі, А. З'яўленне [Электронны рэсурс] / А. Вярцінскі. – Рэжым доступу: https://rv-blr.com/literature/show/3743/. – Дата доступу: 27.12.2023.

3 Русілка, В. Паэтычныя ўрокі чалавечнасці / Вольга Русілка // А. Вярцінскі, Творы. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2009. – С. 5–20.

4 Вярцінскі, Анатоль. Выбраныя творы / Анатоль Вярцінскі; уклад., камент. А. Вярцінскага. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2009. – 528 с.

5 Пашкоў, Г. Песня Праметэям / Г. Пашкоў // Беларусь. – 1981. – № 11. – С. 7.